УДК 372.881.1

# УДАСКАНАЛЕННЕ ПРАДМЕТНА-МЕТАДЫЧНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ НАСТАЎНІКА: ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**Калеснікава Ірына Аляксандраўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Беларусь)
irino4kasashina@mail.ru



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя праблемныя пытанні, якія паўстаюць перад сучаснымі настаўнікамі пры вывучэнні дысцыплін на беларускай мове. Аўтарам размежаваны асноўныя групы такіх пытанняў. Праведзена аналітычная праца з вопыту работы ў сярэдняй школе.*

Сучасная адукацыйная сістэма надае асаблівую ўвагу кампетэнтнаснаму падыходу ў галіне фарміравання і развіцця асобы вучня. *Пры арганізацыі адукацыйнага працэса неабходна вызначыць аптымальнае спалучэнне фундаментальнасці ведаў і іх практычнай накіраванасці, забяспечыць рознаўзроўневае, асобасна-арыентаванае навучанне школьнікаў з улікам іх індывідуальных здольнасцей і асаблівасці матывацыі навучання* [1]. У сувязі з гэтым становіцца актуальнай задача пошуку сродкаў найбольш эфектыўнага выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій.

Звернемся спачатку да тэрміналагічнага паняцця кампетэнцыі. У Адукацыйным стандарце вышэйшай адукацыі 2019 года гаворыцца, што *"кампетэнцыя – гэта веды, уменні, вопыт і асабовыя якасці, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач"* [3]. Вырашаць такія задачы – наша штодзённая праца. Тэарэтычныя задачы мы вырашаем, калі рыхтуем план урока, складаем планаванне нашай настаўніцкай дзейнасці па прадметах і інш. На практыцы ўсё больш складана. Не выпадкова існуе выслоўе Аляксандра Суворава: "*Тэорыя без практыкі мёртвая, а практыка без тэорыі сляпая"*, якое дакладна перадае сутнасць значнасці наяўнасці прадметна-метадычнай кампетэнцыі ў настаўніка і не толькі.

Навучанне беларускай мове ў нашай Рэспубліцы характарызуецца камунікатыўнай накіраванасцю, якая забяспечвае развіццё ў вучняў гатоўнасці да эфектыўных маўленчых зносін у розных сферах дзейнасці.

*Гуманітарнае развіццё асобы – адна з асноўных задач сучаснай школы. У вырашэнні гэтай задачы важнае месца адводзіцца моўнай адукацыі вучняў. Такі падыход прадугледжвае засваенне школьнікамі не толькі сістэмы мовы, але і правілаў функцыянавання яе адзінак у маўленні, што азначае фарміраванне ў вучняў як лінгвістычнай, так і камунікатыўнай кампетэнцыі* [4, с. 2].

Мяркую, што ўсе праблемныя пытанні пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры варта падзяліць на некалькі груп. Часцей за ўсё вылучаюцца наступныя групы пытанняў:

1. Макрасацыяльныя (агульнаграмадскія);
2. Мікрасацыяльныя (школьнае навучанне, сямейнае выхаванне, камунікацыйны асяродак вучня за межамі школы):

2.1 матывацыя класа;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2.2 асаблівасці характару вучня (фізічны і псіхалагічны стан здароўя вучняў).

Разгледзім больш падрабязна кожную з іх.

1. Макрасацыяльныя праблемныя пытанні – гэта пытанні, якія непасрэдна ўплываюць на пачатак і вынік дзейнасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры.

Напрыклад, з-за таго, што беларуская і руская мовы з’яўляюцца раўнапраўнымі ў нашай дзяржаве, *“перад настаўнікам беларускай мовы паўстае складаная задача – навучыць школьнікаў актыўнай маўленчай дзейнасці на нацыянальнай мове”* [5, с. 3]. Становіцца зразумела, што для паўнацэннага, ўсебаковага авалодання вучнямі мовай трэба стварыць якасныя ўмовы ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі. Тут ўзнікае ланцужок: настаўнік – адміністрацыя школы – Упраўленне адукацыі раёна, горада, вобласці – Міністэрства адукацыі. Таму што не кожная школа на сённяшні дзень мае добрую тэхнічна-матэрыяльную базу, каб стварыць неабходныя ўмовы для паўнацэннага сучаснага інтэрактыўнага ўрока.

Акрамя гэтага, праблемы актыўнага выкарыстання беларускай мовы насельніцтвам ствараюцца таксама тым, што ў Беларусі ўсяго трынаццаць працэнтаў вучняў, у якіх навучанне праводзіцца па-беларуску. Астатнія восемдзесят тры працэнты – рускамоўныя. Зразумела, што, пры далейшым змяншэнні працэнту навучання па-беларуску, мова амярцвее. У відэаінтэрв’ю ад 31 мая 2017 года дэпутатка Алена Анісім гаварыла пра праблемы школ з беларускай мовай навучання. Па яе словах, *“актуальнай у наш час з’яўляецца праблема закрыцця беларускамоўных школ і гімназій, ці перавод іх на рускамоўнае навучанне, што дрэнным чынам адбіваецца на папулярызацыі роднай мовы”* [2].

2. Мікрасацыяльныя праблемныя пытанні.

Да дадзенай групы праблемных пытанняў лічу правільным аднесці наступнае:

– школьнае навучанне;

– матывацыя настаўніка;

– матывацыя класа;

– асаблівасці характару вучня (фізічны і псіхалагічны стан здароўя дзіцяці);

– Сямейнае выхаванне.

Школьнае навучанне.

Як маладому настаўніку, мне давялося сутыкнуцца з шэрагам праблем пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры (тым больш, што раней быў толькі двухгадовы вопыт выкладання рускай мовы і літаратуры). Але да



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэтых праблем я буду адносіць фактары, якія негатыўна ўплываюць на навучанне ў цэлым.

Прыйшоўшы на пасаду настаўніка беларускай мовы і літаратуры ў 5-я і 8 класы я высветліла, што цяперашнія вучні слаба падрыхтаваныя да ўспрымання роднай мовы. Прыкладна 5–10 працэнтаў з іх не разумеюць, што я тлумачу на ўроку. Таму, на некаторых уроках у 5 класе прыходзіцца тлумачыць па некалькі разоў значэнне такіх простых слоў, як “сонейка”, “зразумела”, “абутак” і інш. Гэтыя, так званыя, рэмаркі адцягваюць увагу ад асноўнай тэмы ўрока. Для вучняў 8 класа базавага ўзроўня навучання вельмі цяжкім здаецца заданне прачытаць 12 старонак тэксту і пераказаць іх змест, або змест урыўка з тэксту па-беларуску. Тут узнікае праблема ацэнкі такога пераказу (ці адказу на рускай мове), нават, калі па-руску змест перададзены абсалютна дакладна. Рускамоўнае асяроддзе школы таксама не спрыяе замацаванню ў вучнёўскай свядомасці роднай мовы.

Матывацыя настаўніка.

Актуальнай праблемай з’яўляецца і матывацыя настаўніка на ўрок.

Настаўнік – у першую чаргу – жывы чалавек, у якога ёсць уласнае стаўленне да выкладаемага ім прадмета. Матывацыя настаўніка, ў сваю чаргу, залежыць ад шэрагу фактараў:

– узровень прадметна-метадычнай кампетэнцыі;

– стан здароўя;

– узаемаадносіны з калектывам школы/ кафедрай настаўнікаў;

– эмацыйны настрой класа.

Эфектыўная праца настаўніка магчыма толькі пры пазітыўным праяўленні вышэй пералічаных фактараў.

Матывацыя класа цесна звязана з матыванасцю настаўніка на ўрок. Даволі рэдка ў наш час сустракаюцца класы, дзе хаця б палова вучняў на ўроку мэтанакіравана вывучаюць беларускую мову ці літаратуру. Для іх здаюцца цяжкімі і незразумелымі словы нашай роднай мовы, таму яны хутка страчваюць цікавасць да ўрока. А гэта значыць, што і да вывучэння мовы ў цэлым. І толькі настаўніку падуладна зрабіць урок незвычайным, markрознабаковым, пазнавальным. Актыўнае ўключэнне вучняў у пазнавальны працэс – палова поспеху на ўроку. Разнастайнасць форм і метадаў працы – важныя элементы для ўтрымання ўвагі сучаснага школьніка.

Таксама нельга забываць і пра сучасны **асобасны** падыход да навучання. Своечасовыя назіранні за характарам вучня, размовы з класным кіраўніком, з бацькамі спрыяюць высвятленню характэрных рыс характару вучня, стана яго эмацыйнага і фізічнага здароўя. Такая аналітычная праца дазваляе знайсці падыход да кожнай дзіцячай асобы. Але праблема ў тым,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што ў класе, дзе навучаецца больш за дваццаць чалавек, цяжкай становіцца рэалізацыя асобаснага падыходу. Выйсце з дадзенай сітуацыі ў агульнай сярэдняй школе мы знаходзім у рознаўзроўневых заданннях, правядзенні факультатыўных, падтрымліваючых, стымулюючых і рэпетытарскіх заняткаў па мове і літаратуры і т. п.

Сямейнае выхаванне – значны штуршок для паспяховага авалодання беларускай мовай і літаратурай вучнем. Агульнавядома, што асновы сямейных каштоўнасцей перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Але сёння перад настаўнікам паўстае пытанне данясення да сям'і значнасці камунікацыі на беларускай мове. Наша мова – неацэнны скарб, які мы павінны захаваць, каб не згубіць сваёй нацыянальнай свядомасці. Размовы з прадстаўнікамі старэйшага пакалення, чытанне дома кніг, часопісаў, напісаных па-беларуску, прагляд беларускамоўных спяктаклей, фільмаў, тэлеперадач – усё гэта спрыяе накапленню слоўнікавага запаса ў вучня. Дадзены падыход магчыма рэалізаваць, калі бацькі зацікаўлены ў паспяховым авалоданні іх дзіцяці роднай мовай і літаратурай. А такіх бацькоў на сённяшні дзень вельмі мала. Недарэмна яшчэ Ф. Меркуры гаварыў: *"Чым болей у мяне праблем, тым лепей мае песні"*.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што кожная праблема рана ці позна вырашыцца. І, калі настаўнік зацікаўлены, то яго ўрокі будуць усё лепей і лепей падпарадкоўвацца сучасным адукацыйным патрабаванням.

**Спіс літаратуры**


1. Актуальныя праблемы выкладання беларускай мовы. – Рэжым доступу: http://gerviaty-school.of.by/pr_ur. – ДУА "Гравятская сярэдняя школа". – Дата доступу: 02.02.2021.

2. Алена Мікалаеўна Анісім – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Алена_Мікалаеўна_Анісім. – Дата доступу: 04.02.2021.

3. Кампетэнцыя – Рэжым доступу: http://multilang.etalonline.by/be/Term/Index/29173?langName=be&size=25&page=5&type=3. – Дата доступу: 02.02.2021.

4. Корбан, Т. В. Беларуская мова і літаратура : вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне "Методыка выкладання беларускай мовы" / Т. В. Корбан. – Гомель. – 2016.

5. Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе: новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А. І. Бельскі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – 228 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова